**Н.А. Ляйко**, *дацэнт*,
**А.І. Фядорына**, *старшы выкладчык*,
**А.М. Фёдарава**, *дацэнт*

# ІНФАРМАЦЫЙНАЕ І ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

(курсы "Каталагізацыя дакументаў" і "Бібліятэчныя фонды")

Тэорыя педагогікі і практыка пераконваюць, што тыя веды, якія засвоены ў працэсе самастойнай работы, паступова дапаўняюцца, развіваюцца, становяцца неабходнымі, садзейнічаюць з'яўленню творчых задум і іх рэалізацыі ў практычнай дзейнасці. Якасць універсітэцкай адукацыі непасрэдна звязана з сістэмай стымулявання розных формаў актыўнасці студэнтаў, самастойнай работы. Гэтым тлумачыцца цікавасць выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў да пытанняў арганізацыі, правядзення і кантролю самастойнай работы.

Праблеме арганізацыі самастойнай работы прысвечаны шэраг педагагічных даследаванняў (С.І. Архангельскага, Я.Д. Грыгаровіч, Н.В. Драздовай, В.Л. Жук, В.В. Сергеяенкавай, З.А. Скрыпко, П.П. Лабанавай, Т.В. Швалевай і інш.), у якіх самастойная работа студэнтаў разглядаецца як састаўная частка вучэбна-прафесійнай дзейнасці, якая мае адпаведную матывацыю, прадмет і механізм рэалізацыі. Разам з тым існуе шэраг праблем як тэарэтычнага, так і практычнага характару. У прыватнасці, у сучаснай педагагічнай літаратуры адсутнічае агульнапрызнаная класіфікацыя відаў (формаў, узроўняў) самастойнай работы, у сувязі з чым існуе неаднназначнае тэрміналагічнае тлумачэнне паняццяў.

На сучасным этапе вылучаюцца дзве асноўныя формы самастойнай работы (В.Л. Жук):

– уласна самастойная работа студэнтаў, арганізаваная самім студэнтам, пазааўдыторная, вядомая як самападрыхтоўка;

– кіруемая самастойная работа студэнтаў, якая арганізавана выкладчыкам для выканання студэнтамі вучэбнага задання. Яна можа быць як у аўдыторыі, так і па-за яе межамі.

Кантралюемая самастойная работа з'яўляецца відам кіруемай.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У нашым артыкуле мы паспрабуем разгледзець змест, асаблівасці і магчымасці ўсіх этапаў арганізацыі кіруемай самастойнай работы пры вывучэнні курсаў "Каталагізацыя дакументаў" і "Бібліятэчныя фонды", надаючы пэўную ўвагу іх інфармацыйнаму і метадычнаму забеспячэнню.

На *першым этапе* – падрыхтоўчым – асаблівая ўвага намі надаецца ўводнай лекцыі, у якой разглядаюцца структура курса і яго развіццё, стан, праблемы, перспектывы. Падкрэсліваецца яго значэнне ў практычнай дзейнасці, выкарыстанне ва ўсіх працэсах бібліятэчнай работы. Кожная наступная лекцыя дапаўняе і развівае ўводную, абгрунтоўвае стымул і ўвагу да вывучэння прадмета, неабходнасць пастаяннай працы над гэтым курсам.

Самастойная работа як від вучэбнай дзейнасці, на нашу думку, залежыць ад такіх фактараў, як:

– матэрыяльная база;
- стымуляванне выкладчыкаў і студэнтаў;
- падрыхтаванасць ВНУ, выкладчыка і студэнта да такога віду дзейнасці.

З іх улікам складзены рабочыя праграмы з указаннем тэм і заданняў для самастойнай работы на семестр. Дадзеныя матэрыялы зацверджаны на пасяджэнні кафедры, савета факультэта і прадстаўлены ў электронную бібліятэку універсітэта.

На *другім этапе* ажыццяўляецца непасрэднае азнаямленне студэнтаў з заданнямі для самастойнай работы, тлумачыцца методыка выканання, указваецца графік прадстаўлення прамежкавых вынікаў для кантролю.

Выкладчыкамі кафедры ўвага надаецца інфармацыйнаму і вучэбна-метадычнаму забеспячэнню самастойнай работы. Усе курсы забяспечаны адпаведнай метадычнай дакументацыяй ("Бібліятэчныя фонды") або комплексамі ("Каталагізацыя дакументаў"), у якіх ёсць усе неабходныя метадычныя распрацоўкі (тэматычныя планы лекцыйных, семінарскіх і практычных заняткаў; указанні да заданняў па самастойнай рабоце з рэкамендацыямі формаў кантролю і тэрмінаў іх выканання; прыведзены ўказанні да заданняў кантрольных работ, тэматыка курсавых і дыпломных работ). Для правядзення дробнагрупавых заняткаў па тэме «Стварэнне бібліяграфічных запісаў у АБІС

"IRBIS"» распрацаваны метадычныя ўказанні: заданні, методыка і алгарытм выканання аперацыі пры падрыхтоўцы машыначытальнага бібліяграфічнага запісу з выкарыстаннем праграмнага забеспячэння "IRBIS".

Па абодвух курсах ("Бібліятэчныя фонды" і "Каталагізацыя дакументаў") у электроннай бібліятэцы, акрамя вучэбна-метадычнай дакументацыі, ёсць і праграмы курсаў. У комплексе па курсу "Каталагізацыя дакументаў" студэнты могуць азнаёміцца з рэйтынгавай сістэмай і методыкай правядзення вучэбнай дзелавой гульні па тэме "Вызначэнне якасці і эфектыўнасці выкарыстання сістэматычнага каталога". Комплекс мае дадаткі ў дапамогу студэнтам пры выкананні самастойных работ па каталагізацыі:

– пашпарт-характарыстыку каталога;
– машыначытальныя фарматы;
– зводную табліцу апазнавальных знакаў УДК.

У электронную бібліятэку намі змешчана папка "Стандарты по библиотечному делу".

На *трэцім этапе* – кантрольна-ацэначным – паступова, адпаведна вывучэнню праграмнага матэрыялу падводзяцца яго вынікі. Мяркуем, што найбольш грунтоўнай формай арганізацыі вучэбнай дзейнасці на гэтым этапе з'яўляецца рэйтынгавая сістэма.

Заслугоўвае ўвагі і такая форма кантролю, як выкананне творчых работ. У прыватнасці, па курсу "УДК" студэнты складаюць алфавітна-прадметны паказальнік да раздзела "33 Эканоміка. Эканамічныя навукі". Трэба адзначыць зацікаўленасць студэнтаў, творчы падыход, а ў выніку – задавальненне ад працы.

Але ідзе час, змяняюцца ўмовы, узнікаюць новыя патрабаванні, а з імі і формы правядзення самастойнай работы студэнтаў. Абагульняючы практычны вопыт іншых ВНУ і ўласны, адзначым, што на сучасным этапе, на нашу думку, адной з формаў арганізацыі кіруемай самастойнай работы студэнтаў можна лічыць электронны рабочы сшытак. Улічваючы наяўнасць лакальнай сеткі, індывідуальных профіляў выкладчыкаў і студэнтаў, а таксама пажаданні студэнтаў (па выніках іх апытання), можна рэкамендаваць гэту форму самастойнай работы для любой дысцыпліны.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Структура электроннага рабочага сшытка можа быць рознай. Напрыклад, яна можа ўключаць заданні па пэўных модулях, пры гэтым кожны модуль можа быць прадстаўлены пэўнай колькасцю заданняў рознай складанасці: даць азначэнне паняцця, вылучыць элементы бібліяграфічнага запісу, растлумачыць прызначэнне прадпісаных знакаў пунктуацыі, зрабіць канспект тэмы і г. д. Да электроннага рабочага сшытка неабходна скласці графік выканання пэўных раздзелаў і ведамасць паспяховасці.

Плануецца кожнаму студэнту прадаставіць індывідуальныя ЭРС у адпаведнасці з нумарам заліковай кніжкі.

У якасці кантролю намі выкарыстоўваюцца:

– выніковыя экзамены і залікі ў канцы семестра;
– індывідуальныя гутаркі і кансультацыі з выкладчыкам;
– праверка рэфератаў і пісьмовых дакладаў ("Бібліятэчныя фонды");
– тэсціраванне (абодва курсы);
– вучэбная дзелавая гульня ("Каталагізацыя дакументаў");
– кантрольныя работы;
– праверка канспектаў практычных заняткаў;
– падвядзенне вынікаў рэйтынгавай сістэмы.

Такім чынам, для актывізацыі самастойнай работы і павышэння яе эфектыўнасці ў першую чаргу неабходны: матывацыя да атрымання ведаў; сфарміраванасць у студэнтаў уменняў і навыкаў, указаных у стандарце; спалучэнне індывідуальнай работы з групавой; адпаведнае інфармацыйнае і метадычнае забеспячэнне; разнастайнасць самастойнай работы па змесце і формах, добрая яе арганізацыя, якая не стварае перагрузкі ў вучобе.

1. *Контролируемая* самостоятельная работа студентов в образовательном процессе: пути и методы совершенствования / редкол.: П.В. Гарелик [и др.]. – Гродно, 2006. – 251 с.

2. *Организация* самостоятельной работы студентов на факультете вуза: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 16–17 ноября 2006 г. – Мн.: БГУ, 2006. – 351 с.

3. *Самостоятельная* работа слушателей по курсу "Педагогические технологии". – Мн.: БГПУ, 2006. – 75 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Швалева, Т.В.* Организация самостоятельной работы учащихся при обучении физике в классах гуманитарного профиля: дис... канд. пед. наук: 13.00.02: теория и методика обучения и воспитания (физика в общеобразовательной и высшей школе) / Т.В. Швалева. – Томск, 2006. – 17 с.

**О.В. Мазаник,** *доцент*

## СПЕЦИФИКА САМОСТОЯТЕЛЬНОЙ РАБОТЫ СТУДЕНТОВ НА ВЫПУСКАЮЩИХ КАФЕДРАХ
(факультет музыкального искусства)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В широком смысле под самостоятельной работой следует понимать совокупность всей самостоятельной деятельности студентов как в учебной аудитории в контакте с преподавателем, так и вне ее. При изучении спецдисциплин организация самостоятельной работы должна представлять единство двух взаимосвязанных форм:

– внеаудиторная самостоятельная работа;

– аудиторная самостоятельная работа, которая осуществляется под непосредственным руководством преподавателя.

Отметим, что внеаудиторная самостоятельная работа студентов творческих вузов является не просто важной, а одной из основных форм учебного процесса. Вместе с тем активная самостоятельная работа возможна только при наличии серьезной и устойчивой мотивации. Один из сильнейших мотивирующих факторов – подготовка к дальнейшей эффективной профессиональной деятельности, что характерно именно для творческих специальностей. Если фактором полезности выполнения самостоятельной работы по общим дисциплинам является, например, использование результатов этой работы для ответа на семинаре, зачете или экзамене, то для студентов, связанных с музыкальным исполнительством, самостоятельная работа и есть один из видов профессиональной подготовки.

Учебный процесс предусматривает планирование объема внеаудиторной самостоятельной работы в рабочих учебных планах